*А. І. БАБКО*

# ТРАДЫЦЫЯ ЯК КАШТОЎНАСЦЬ: ФІЛАСОФСКАЯ АНАЛІТЫЧНАЯ ПЕРСПЕКТЫВА І БЕЛАРУСКІ КУЛЬТУРНЫ КАНТЭКСТ

*Культурная традыцыя разглядаецца аўтарам у аксіялагічным аспекце. У якасці тэарэтычнай асновы даследавання выступаюць ідэі філасофскай герменеўтыкі. Выяўляюцца – як у агульнатэарэтычным плане, так і ў кантэксце працэсаў, што адбываюцца ў беларускай культурнай прасторы, – умовы, неабходныя для забеспячэння высокага каштоўнаснага статусу культурнай традыцыі. Раскрываецца яе глыбокая ўзаемасувязь з мовай, абгрунтоўваецца значэнне мовы для захавання і паспяховага развіцця нацыянальнай культуры.*

Чалавечае быццё неад’емным чынам змяшчае ў сабе аксіялагічны аспект, у якім выяўляюцца напружаныя ўзаемадачыненні належнага і існага, ідэалу і рэальнасці, патрэб і наяўных сродкаў іх задавальнення. Таму зразумела, што звязаная з каштоўнаснымі арыентацыямі чалавека і чалавецтва праблематыка займае істотнае месца ў сучасных філасофскіх і навуковых даследаваннях. Шэраг важных і цікавых пытанняў выклікае і ўключэнне ў аксіялагічны даследчы кантэкст вывучэння культурных традыцый. Найпершым пытаннем з’яўляецца пры гэтым праблемны патэнцыял тэзы, згодна з якой культурная традыцыя мае істотнае каштоўнаснае вымярэнне. На самай справе, ці не з’яўляецца наданне ёй статусу духоўнай каштоўнасці самавідавочнай праўдай? Ці мае традыцыя ў гэтым плане патрэбу ў апалогіі?

Неабходна адзначыць, што існуюць важкія гістарычныя і культурныя падставы для таго, каб сцвярджальна адказаць на згаданыя пытанні. Так, у апазіцыі да сучаснага грамадства традыцыйныя формы яго арганізацыі падаюцца не надта прыцягальнымі, бясконца адстаючы ў дынамізме, узроўні крытычнай рэфлексіі, памерах прасторы, неабходнай для самаразвіцця паасобных індывідаў, прыняцця імі свядомых і вольных рашэнняў. Калі разглядаць дадзеную праблему ў кантэксце развіцця філасофскай думкі, патрабаванне рэабілітацыі традыцыйнага аспекту развіцця культуры ставілася ў рамках філасофскай герменеўтыкі, прадстаўнікам якой традыцыя бачылася дыскрэдытаванай і пераможанай у выніку энергічных атак асветніцкай філасофіі [5, с. 281–283].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ці не змяніцца, аднак, сітуацыя, калі мы засяродзім увагу на духоўных аспектах дадзенага феномена? Справа ў тым, што на розных узроўнях мыслення і маўлення паняцці духа, духоўнасці і духоўнага маюць, як правіла, надзвычай высокі аксіялагічны статус. Ці не пераносіцца ён і на ўсё тое, чаму надаецца адпаведны эпітэт, у прыватнасці на культурную традыцыю? Адказ на дадзенае пытанне неабходна пабудаваць на папярэднім аналізе паняцця «дух». Пры першых спробах вырашэння гэтай задачы высвятляецца, аднак, што яна мае ў найвышэйшай ступені няпросты характар: згаданае паняцце нельга акрэсліць строга і адназначна, яно дапускае розныя інтэрпрэтацыйныя стратэгіі, часам (у рамках аналітычнай філасофіі) увогуле выказваецца меркаванне пра няслушнасць і бесперспектыўнасць філасофскага яго разгляду [7, с. 154].

Тым не менш, нягледзячы на адзначаныя вышэй грунтоўныя цяжкасці і насуперак названай рэстрыктыўнай пазіцыі, магутныя намаганні філасофскага мыслення, скіраваныя на высвятленне існасці духоўнага, далі свой плён. Найперш у гэтым плане неабходна адзначыць творчасць Гегеля, для якога дух выступае як найвышэйшая сфера рэчаіснасці і разам з тым як сфера вельмі шырокая: яна ўключае грамадства ва ўсіх яго праявах, у тым ліку і ў супярэчлівых. Унутраная супярэчлівасць духоўнага ўвогуле разглядаецца філосафам як крыніца яго жывасці, рухомасці і дынамічнасці. Дух здольны вытрымаць самую вострую, самую напружаную супярэчнасць і ператварыць яе ў фактар руху і развіцця. У выніку выкліканага ўнутраным самараздваеннем змагання (мэтай якога з'яўляецца аднаўленне цэласнасці і адзінства) ён дасягае глыбокага самаўсведамлення і самавызначэння. Філосаф сцвярджае ў дадзенай сувязі, што знакамітая сакратаўская максіма «Пазнай самога сябе» выступае як найважнейшы прынцып усякага духоўнага ўтварэння [6, с. 431].

Аднак калі дух разглядаецца як у найвышэйшай ступені складаная і супярэчлівая з'ява, наданне эпітэта «духоўны» якому-небудзь феномену не дае ніякіх гарантый яго каштоўнасці і значнасці: у духоўнай сферы заўжды і ва ўсіх яе сегментах і праявах могуць паўстаць і паўстаюць негатыўныя моманты, цяжкасці і калізіі, праз якія трэба прайсці, якія трэба пераадолець, дзеля таго каб рухацца наперад. Гэта мае моц, безумоўна, і ў дачыненні да духоўнай традыцыі, якая інтэрпрэтуецца тут менавіта ў рэчышчы рэалістычнага гегелеўскага падыходу: яе духоўнасць вызначаецца тым, што здзяйсненне традыцыйнага адбываецца праз дзейнасць самасвядомых індывідаў. Раздваенне, супрацьлегласць, дыферэнцыяцыя, канфрантацыя з іншым і памкненне знайсці сябе ў ім выступаюць як істотныя характарыстыкі такой дзейнасці, а таму і тых традыцый, што праз яе рэалізоўваюцца.

Такім чынам, тэза пра каштоўнасны статус духоўнай традыцыі не з'яўляецца самавідавочнай і патрабуе абгрунтавання – і ў сучасных умовах больш пільнага, чым у адносна нядаўнім мінулым. Гэта звязана з дамінаваннем у глабалізаваным свеце інавацыйных стратэгій і мадэляў індывідуальных і калектыўных паводзін, у той час як традыцыйныя іх формы асуджаны на нікчэмнае, маргінальнае існаванне.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

Сітуацыя робіцца яшчэ больш складанай пры разглядзе дадзенай праблематыкі ў нашым культурным кантэксце, бо ў ёй выяўляюцца нюансы і неабходнасць абгрунтавання высокага каштоўнаснага статусу традыцыі істотна ўзмацняецца. Наданне традыцыі грунтоўнай значнасці, разгляд яе як каштоўнасці, памкненне да культывацыі могуць успрымацца (што зусім не абавязкова павінна адбывацца ў артыкуляванай, дыскурсіўнай форме) як адгалосак і наступства неспрыяльных абставін і недасканалага характару станаўлення беларусаў як нацыі. У сувязі з гэтым цалкам заканамерным і натуральным выглядае патрабаванне акцэнтаваць у стратэгіях нацыянальнага будаўніцтва неабходнасць інтэнсіўнага прасоўвання наперад сучаснай, гарадской, дынамічнай беларускай культуры. (Варта адзначыць, што шмат у чым падобная задача – «расьсяляніць», «адмужычыць» паняцце Беларусі, «атрэсьці яго ад сацыяльнай закамплексаванасьці» – успрымалася духоўнай элітай беларускага народа як грунтоўная і актуальная яшчэ ў пачатку XX ст. [3, с. 123].)

Калі высокі каштоўнасны статус традыцыі не з’яўляецца самавідавочным фактам, то на чым можа грунтавацца адпаведнае сцверджанне? І эмпірычнае вывучэнне, і тэарэтычны аналіз культурных працэсаў, што разгортваюцца ў сучасным свеце, сведчаць пра глыбокую ўзаемасувязь у іх момантаў дынамікі, зменлівасці, руху і захавання, стабільнасці і ўспадкоўвання (што цалкам адпавядае ідэям бацькоў-стваральнікаў дыялектыкі, у абсягу якой станоўчае і адмоўнае разглядаюцца як шчыльна звязаныя паміж сабой). Культурныя навацыі маюць грунт і сэнс праз традыцыі, якія, у сваю чаргу, набываюць праўдзівую форму рэалізацыі дзякуючы навацыям (як указвае Г.-Г. Гадамер, «традыцыя паводле сваёй сутнасці з’яўляецца захаваннем, наколькі яно задзейнічана ва ўсіх гістарычных зменах» (пераклад наш. – *А. Б.*) [5, с. 286]).

З прыведзеных палажэнняў вынікае, што наданне традыцыйнаму аспекту культуры каштоўнаснага статусу зусім не азначае адсутнасці ў ім унутранай дыферэнцыяцыі. Ёсць традыцыі, што выяўляюць грунтоўны патэнцыял з пункта гледжання здольнасці да самаразвіцця і адкрыцця шырокіх магчымасцей для творчай самарэалізацыі іх носьбітаў, і ёсць нежыццяздольныя традыцыйныя формы і плыні, што сапраўды не ў стане вытрымаць магутныя крытычныя атакі аўтаномнага розуму, які так высока ставіла філасофія Асветы.

Адзначаныя характарыстыкі культурных працэсаў назіраюцца, безумоўна, і ў развіцці беларускай культуры. Дыферэнцыяцыя традыцый, іх канкурэнцыя і ўзаемаўплыў, шчыльнае ўзаемадзеянне традыцыйнага і інавацыйнага пачаткаў (без якога паспяховае культурнае развіццё ўвогуле немагчыма) уласцівыя ёй, як і ўсякаму іншаму культурнаму ўтварэнню. І ў кантэксце свядомай культуратворчасці надзвычай важна стымуляваць адпаведныя тэндэнцыі, стратэгіі і памкненні: дзякуючы ім культура застаецца ў поўным сэнсе жывой.

У сувязі з гэтым неабходна падкрэсліць, што каштоўнаснае вымярэнне традыцыі ў нашых умовах ні ў якой ступені не страчваецца, як не губляецца і яе сапраўднае прызначэнне: забяспечыць пераемнасць і бесперапыннасць культурнага самаразвіцця нацыі. Акрамя таго, як указвае Г.-Г. Гада-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

мер, традыцыйны аспект духоўнага жыцця змяшчае ў сабе істотны пазнавальны патэнцыял. Філосаф піша, што гуманітарныя даследаванні абавязкова адбываюцца ў рэчышчы гістарычнай традыцыі і выступаюць як яе арганічная частка. Таму ў пачатку ўсякай гістарычнай герменеўтыкі мусіць стаяць зняцце абстрактнай супрацьлегласці паміж трансляцыяй пэўнага зместу, што разгортваецца ў часе як на індывідуальным, так і на калектыўным узроўні, і спробамі яго навуковага пазнання [5, с. 287–289]. Гэта азначае, аднак, што момант пазнання, рацыянальнага дачынення да свету, момант аўтаноміі і свабоды індывіда зусім не знаходзіцца ў стане безумоўнага супрацьстаяння з традыцыяй, якая на самай справе належыць да свабоды і гісторыі [5, с. 286].

Такім чынам, філасофская герменеўтыка нацэльвае на свядомае, настойлівае і няўхільнае здзяйсненне «сінтэтычных» стратэгій культуратворчасці, у якіх традыцыйным формам духоўнага жыцця надаецца грунтоўнае значэнне. Скіраваны да рухомага, дынамічнага сінтэзу супрацьлеглых пачаткаў падыход павінен здзяйсняцца і на ўзроўні традыцыйнага аспекту культуры. Момант жывасці, рухомасці, развіцця мае пры гэтым грунтоўнае значэнне: у ім выяўляецца найбольш прыцягальны для чалавека аспект яго быцця ў свеце – аспект творчасці. «Усё істнуючае творча», – даводзіў Ігнат Абдзіраловіч і нацэльваў нас на творчае абыходжанне з нашай традыцыяй, з уласцівымі ёй жыццёвымі формамі [1, с. 38–39]. Калі ў яе абсягу творчае засваенне і пераўтварэнне рэчаіснасці будзе немагчымым, яна згубіць прыцягальнасць для чалавека, гэта значыць страціць статус духоўнай каштоўнасці. (Ідэнтычныя думкі выказваў у дадзенай сувязі і В. Ластоўскі, паводле якога «дух людскі – сіла творчая, каторая не можа толькі патураць чужым узорам, не даючы нічога з сябе» [4, с. 311].)

Такім чынам, неабходна шукаць шляхі да арганічнага і творчага спалучэння ў рамках свядомай культывацыі традыцый грунтоўных супрацьлегласцей – і найперш, з аднаго боку, нацыянальнага і наднацыянальнага, а з іншага, – нацыянальнага і індывідуальнага. Агульначалавечае як найвышэйшая форма наднацыянальнага з неабходнасцю прадстаўлена ў структуры культурных традыцый, уласцівых кожнай нацыянальнай культуры. Магутнае памкненне да адэкватнай рэалізацыі ўніверсальнага ў адметным выяўляецца і ў беларускай культурнай традыцыі, што знайшло яскравае ўвасабленне ў творчасці яе выдатных прадстаўнікоў (дастаткова прыгадаць Купалава «людзьмі звацца»). І калі кожная адметная (у тым ліку і нацыянальная) форма здзяйснення ўніверсальнага ў сваю чаргу спрыяе яго развіццю і ўзбагачэнню, то яна павінна разглядацца і як сапраўдная агульначалавечая каштоўнасць. Таму беларуская культурная традыцыя з'яўляецца набыткам не толькі беларускага народа, але і ўсяго чалавецтва. І хоць у няпростых умовах глабалізаванага свету яе прышласць выклікае трывогу, тым не менш успрыманне нашай традыцыі як бясцэннай каштоўнасці надае ўсім тым, хто неабыякавы да яе лёсу, сілы і волі да змагання за яе захаванне і далейшае развіццё.

Надзвычай важным у кантэксце згаданага змагання з'яўляецца і той момант, што далучэнне да нашай традыцыі, да нашага (і агульначалавечага) духоўнага скарбу з'яўляецца ў найвышэйшай ступені спрыяльным

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фактарам гарманічнага самаразвіцця асобы. Усе тыя выдатныя постаці, якімі ганарыцца беларускі народ, сваёй прыгажосцю, творчасцю, жыццём яскрава засведчылі праўдзівасць згаданай тэзы. Памкненне да гарманічнага яднання індывідуальнага, нацыянальнага і агульначалавечага ўвогуле выступае як грунтоўны прынцып нашай культурнай традыцыі (высокае мастацкае ўвасабленне дадзены прынцып знайшоў у рамане У. Караткевіча «Каласы пад сярпом тваім» у вобразе Алеся Загорскага).

Разам з тым нельга забываць і пра шчыльную сувязь беларушчыны і трагізму, што неаднаразова выяўлялася ў нашай гісторыі (неймаверна высокай сілы і напружанасці яна дасягнула ў жыцці Алеся Гаруна). Тым не менш выразная прысутнасць трагічнага ў рэчышчы разгортвання беларускай культурнай традыцыі не павінна паралізаваць волю да барацьбы за яе будучыню ў тых, хто абраў гэты шлях: у рэшце рэшт яно наяўнае ў гістарычным лёсе кожнага народа, і наўрад ці мы маем права весці гаворку пра сваю абранасць ці выключнасць у гэтым плане.

Неабходна адзначыць, што духоўны элемент, у якім найбольш адэкватна здзяйсняецца культурная традыцыя, – гэта мова. Яна фігуруе як надзвычай важны сродак захавання назапашанага чалавецтвам, народам і індывідам у працэсе іх канфрантацыі з рэчаіснасцю вопыту і як эфектыўны інструмент распрацоўкі інавацыйных духоўных стратэгій. Прадстаўнікі філасофскай герменеўтыкі ўвогуле ўказваюць на ўніверсальны статус моўнай карціны свету, звязаны з універсальнасцю яе падмурка – натуральнага дачынення чалавека да рэчаіснасці. Гэтае дачыненне здзяйсняецца ў мове, і яно ўсёабдымнае: няма ніякай іншай пазіцыі, якая дазваляла б ахапіць усё магчымае, уключаючы саму мову. Навуковая карціна свету выглядае ў дадзенай сувязі як штосьці адноснае, што мае свой грунт і ахопліваецца менавіта ва ўніверсальным моўным цэлым [5, с. 454–457].

Наданне высокага каштоўнаснага статусу традыцыі з неабходнасцю цягне за сабой, такім чынам, адпаведна высокую ацэнку мовы. Яе грунтоўнае значэнне для жыццяздольнасці нацыянальнай культуры ясна ўсведамляецца і падкрэсліваецца выдатнымі прадстаўнікамі беларускага народа. Так, В. Ластоўскі даводзіць, што «родная мова – гэта музыка душы, каторай Навышні Стварыцель адарыў чалавека, гэта натуральны фундамент, на каторым чалавек павінен будаваць дом сваёй сілы духоўнай, свайго розуму, пачуцці дабра і зла, справядлівасці і крыўды, красы і брыдзі» [4, с. 280]. З вялікай мастацкай сілай высокі каштоўнасны статус роднай мовы фіксуецца ў беларускай літаратуры. «Дык шануй, беларус, сваю мову – / Гэта скарб нам на вечныя годы», – заклікае кожнага з нас Алесь Гарун [2, с. 42], і кожны з нас павінен разумець, што адзіны адэкватны спосаб згаданага шанавання – жыць у роднай мове, тварыць у ёй, гэта значыць спрыяць яе развіццю, а разам з ёй і развіццю нашай культурнай традыцыі.

Такім чынам, хоць высокі каштоўнасны статус духоўнай традыцыі і не з'яўляецца самавідавочным, мы можам абгрунтаваць яго неад'емнасцю традыцыйнага пачатку ў развіцці культуры, шчыльнай сувяззю традыцыйнага і інавацыйнага аспектаў развіцця. Згаданая сувязь назіраецца і ў беларускай культурнай прасторы. Больш за тое, яна павінна свядома культывавацца дзеля таго, каб развіццё беларускай культуры было паспяховым.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Высокі каштоўнасны статус нашай культурнай традыцыі (як, зрэшты, і іншых нацыянальных традыцый) вызначаецца тым, што яна выступае як адметнае ўвасабленне агульначалавечага і спрыяе багаццю і разнастайнасці духоўнага жыцця ўсяго чалавецтва. Разам з тым далучэнне да яе ўзбагачае асобу, самым грунтоўным чынам спрыяючы яе гарманічнаму самаразвіццю. Таму найважнейшай задачай нацыянальнага дыскурсу з'яўляецца распрацоўка стратэгіі яе захавання ў надзвычай складаных умовах глабалізаванага свету. Істотнае месца ў рамках гэтай стратэгіі павінна належаць выяўленню эфектыўных шляхоў забеспячэння годнай будучыні роднай мовы, якая мае ў кантэксце паспяховай нацыянальнай культуратворчасці найгрунтоўнейшае значэнне.

1. *Абдзіраловіч, І.* Адвечным шляхам : дасьледзіны беларускага сьветагляду / І. Абдзіраловіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 44 с.

2. *Гарун, А.* Выбраныя творы / А. Гарун. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 2003. – 448 с.

3. *Запруднік, Я.* Беларускае (дваццатае) стагодзьдзе : Параўнальная рэтраспэктыва / Я. Запруднік // Нацыянальныя пытанні : матэрыялы III Міжнар. кангрэса беларусістаў «Беларуская культура ў дыялогу цывілізацый». – Мінск : Беларускі кнігазбор, 2001. – С. 120–126.

4. *Ластоўскі, В.* Выбраныя творы / В. Ластоўскі. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 1997. – 512 с.

5. *Gadamer, H-.G.* Hermeneutik : Wahrheit und Methode / H.-G. Gadamer // Gesammelte Werke / H-.G. Gadamer. – Tübingen : J. C. B. Mohr (Paul Siebeck), 1990. – Bd. 1 : Grundzüge einer philosophischen Hermeneutik. – 495 s.

6. *Hegel, G. W. F.* Grundlinien der Philosophie des Rechts, oder Naturrecht und Staatswissenschaft im Grundrisse / G. W. F. Hegel ; hrsg. von Ed. Gans. – Berlin : Duncker und Humblot, 1833. – 440 s.

7. *Oeing-Hanhoff, L.* Geist. Einführung und Überblick / L. Oeing-Hanhoff // Historisches Wörterbuch der Philosophie : in 13 Bänden / hrsg. von J. Ritter, K. Gründer, G. Gabriel. – Basel : Schwabe Verlag, 1974. – Bd. 3. – S. 154–157.

*A. BABKO*

**TRADITION AS A VALUE: PHILOSOPHICAL-ANALYTICAL PERSPECTIVE AND BELARUSIAN CULTURAL CONTEXT**

*The author analyses a cultural tradition in an axiological aspect. The theoretical foundation of the research is based on the ideas of philosophical hermeneutics. The author clarifies the necessary conditions for providing the high value status of a cultural tradition both in the general theoretical aspect and in the context of the processes taking place in Belarusian cultural sphere. The article deals with the idea of deep correlation of cultural tradition with the language and the importance of the language for the preservation and rapid development of national culture.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ